*М. В. КУЗНЯЦОЎ*

# ДЗЕЙНАСЦЬ В. Г. ҚНОРЫНА ПА АДНАЎЛЕННЮ І ЎМАЦАВАННЮ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ Ў БЕЛАРУСІ Ў 1920 г.

Вясной 1920 г. Чырвоная Армія шырока разгарнула наступленне супраць легіянераў буржуазна-памешчыцкай Польшчы, правячыя колы якой пры падтрымцы імперыялістаў Англіі і Францыі развязалі вайну супраць Савецкай Расіі. Асноўны ўдар камандаванне сканцэнтравала на Мінскім напрамку. У ходзе шырока разгорнутага наступлення стварыліся перадумовы хуткага вызвалення сталіцы Савецкай Беларусі і ўсёй рэспублікі. У сувязі з наступленнем Чырвонай Арміі ЦК Қампартыі Літвы і Беларусі 28 мая 1920 г. пастанавіў «у далейшым, да стварэння Рэўкома ў Мінску сакратаром ЦҚ застаецца тав. Қнорын». Было вырашана стварыць Мінскі губрэўком, у які ўвайшоў таксама В. Г. Қнорын. Яму даручалася наладзіць на вызваленай тэрыторыі выхад газеты «Звезда», падрыхтаваць адозву да насельніцтва Беларусі.

Разгортванню наступлення чырвоных войск садзейнічала шматгранная і шырокая барацьба рабочых і сялян акупіраваных мясцовасцей Беларусі, якая накіроўвалася Бюро нелегальнай работы, створаным ЦҚ ҚП(б) ЛіБ.

В. Г. Қнорын ажыццяўляў паўсядзённую работу па кіраўніцтву нелегальнай дзейнасцю падпольных партыйных арганізацый на захопленай легіянерамі тэрыторыі. Тысячамі ніцей ён быў звязаны з Беларуссю, партызанскімі атрадамі Апанаса Паланейчыка, Максіма Уса, Аляксандра Салаўя, Васіля Пагірэйчыка і іншых змагароў за вызваленне рэспублікі. Іх самаахвярная барацьба была надзвычай плённай. Қамандуючы польскай арміі прызнаваўся, што рады польскіх легіянераў «раскладаюцца пад уздзеяннем камуністычнай прапаганды».

Час свабоды набліжаўся. 1 чэрвеня 1920 г. ЦҚ ҚП(б) ЛіБ звярнуўся да рабочых і сялян Літоўска-Беларускай ССР з адозвай, падрыхтаванай В. Г. Қнорыным, у якой гаварылася пра крах легіянераў, пра неабходнасць ісці на дапамогу Чырвонай Арміі, выбіраць па вёсках, валасцях і мястэчках Саветы рабочых і сялянскіх дэпутатаў, браць уладу ў свае рукі, бо «ад вас, сяляне, рабочыя і батракі, залежыць, ці ўтрымаецца назаўсёды ўлада ў вашых мазолістых руках, ці канчатковая наша перамога, ці назаўжды звергнуты прыгнёт дармаедаў-памешчыкаў, капіталістаў і крывапіўцаў-жандараў».

В. Г. Қнорын заклікаў гнаць дармаедаў і здраднікаў, не верыць словаблудству аб падтрымцы Савецкай улады ні нацыяналістам, ні эсэрам. Ён пісаў: «Беларускія эсэры, усякая дробязь, што блытаецца пад нагамі, павінны заявіць, што яны за Савецкую ўладу, інакш яны будуць мёртвыя, як мёртвы меншавізм у Беларусі»[1].

Пілсудчыкі жорстка абараняліся. Адступаючы, яны рабавалі сялян, што не маглі вывезці — знішчалі. Легіянеры расстрэльвалі захопленых падпольшчыкаў, спалілі Барысаў, зруйнавалі Бабруйск. Уражаны гэтымі весткамі, В. Г. Қнорын з гневам пісаў: «Қожны расстрэл, кожны

[1] Кнорин В. Три года // Звезда. 1920. 17 чэрв.



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

спалены дом няхай успомніцца польскім панам, калі яны апынуцца ў руках польскай ці расійскай рабоча-сялянскай улады» [2].

Але ні найноўшая зброя, якая пастаўлена пілсудчыкам імперыялістамі, ні зверствы над мірным насельніцтвам — нішто ўжо не магло выратаваць ворагаў. Для работы на вызваленых тэрыторыях і тых, што знаходзіліся напярэдадні вызвалення, ЦК КП(б) ЛіБ стварaў часовыя партыйна-арганізацыйныя тройкі для кіраўніцтва ўсёй работай на месцах. Тройкі павінны былі правесці перарэгістрацыю членаў партыі падпольных арганізацый, а таксама тых камуністаў, якіх партыя накіроўвала з цэнтра для дапамогі братняй Беларусі ў аднаўленні мірнага жыцця. Тройкі ствараліся на шэсць месяцаў. В. Г. Кнорын, які добра ведаў састаў партыйнай арганізацыі Беларусі, многіх камуністаў асабіста, прымаў актыўны ўдзел у падборы кадраў для партыйна-арганізацыйных троек, якія павінны былі наладзіць ідэалагічную, гаспадарчую і культурна-асветную работу. Так ён сфарміраваў апарат будучага Мінскага губрэўкома, губчэка, губсаўнаркома, павятовых і валасных рэўкомаў.

Тройкі атрымлівалі таксама палітычныя арыенціроўкі. В. Г. Кнорыным была шырока распаўсюджана рэзалюцыя Прэзідыума ЦК КП(б) ЛіБ аб адносінах да партый у вызваляемай Беларусі. Многія з іх скампраметавалі сябе супрацоўніцтвам з акупантамі, некаторыя займалі ў час польскага панавання пазіцыю чакання. Усе польскія, а таксама нацыяналістычныя непралетарскія партыі падлягалі праследаванню як варожыя. «Самая бязлітасная расправа з тымі, арышт і адданне пад суд усіх вінаватых у садзейнічанні акупацыйнай уладзе палякаў — наша асноўная задача» [3],— гаварылася ў рэзалюцыі.

У пісьмах, адрасаваных партыйным тройкам Дзісненскага, Ігуменскага, Барысаўскага, Бабруйскага паветаў, В. Г. Кнорын указваў на неабходнасць узмацніць работу сярод юнакоў і дзяўчат вёскі па прыёму яе ў рады Камуністычнага Саюза Моладзі [4].

Ведаючы, якія цяжкасці чакаюць партыйныя арганізацыі па аднаўленню мірнага жыцця, ён звяртаецца ў Літоўска-Беларускі аддзел ЦК РКП(б) з просьбай накіраваць на працу ў Беларусь бухгалтараў, аграномаў, рахункаводаў, вядзе вялікую перапіску з камуністамі, якіх ведае асабіста і лічыць магчымым выкарыстаць у партыйных і савецкіх установах. За яго подпісам усім партыйным тройкам была разаслана інструкцыя, якая прадпісвала без перашкод рэгістраваць і прыцягваць да працы ў мірных умовах камуністаў, якія працавалі ў нелегальных партыйных арганізацыях. Тых, хто не вёў партыйнай работы ў час акупацыі, але не запляміў сябе супрацоўніцтвам з акупантамі, ён рэкамендаваў залічваць у кандыдаты партыі са змяншэннем партыйнага стажу. Гэтага не патрабавалася ад тых, хто падвяргаўся праследаванням акупацыйных улад і прадстаўляў рэкамендацыі двух камуністаў [5].

ЦК КП(б) ЛіБ надаваў вялікае значэнне аграрнаму пытанню, бо яно закранала тысячы сялян. 24 мая 1920 г. былі прыняты распрацаваныя В. Г. Кнорыным прапановы па землеўладкаванню. «З зямель непрацоўнага карыстання,— гаварылася ў тэзісах,— належыць нацыяналізацыі і пераходзіць у непасрэднае кіраўніцтва Савецкай улады з арганізацыяй на іх народных маёнткаў па прыкладу фабрычна-заводскай прамысловасці не больш за трэцюю частку ўсёй зямлі, што знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі» [6].

Усе іншыя землі адразу ж пасля вызвалення бясплатна перадаваліся сялянам. Адначасова В. Г. Кнорын разаслаў на месцы інструкцыю па кіраўніцтву перадачай зямлі. Часовае кіраванне размеркаваннем зямлі

---

[2] Кнорин В. Бобруйск—Борисов // Звезда. 1920. 8 чэрв.
[3] ПАІГП пры ЦК КПБ, ф. 4, воп. 1, с. 39, л. 18.
[4] ЦДАКР БССР, ф. 8, воп. 1, с. 10, л. 156.
[5] ПАІГП пры ЦК КПБ, ф. 4, воп. 1, с. 6, л. 90.
[6] ЦДАКР БССР, ф. 8, воп. 1, с. 2, л. 1.

ўскладвалася на рэўкомы. Ім прадпісвалася высяляць памешчыкаў і ўпраўляючых з маёнткаў, высвятляць патрэбы сялян у зямлі, прыгоднасць маёнткаў, схільнасць сялян да калектыўнай працы [7].

Аграрнае пытанне знаходзілася ў цэнтры ўвагі як сялян Беларусі, так і Літвы. У сувязі з тым, што старшыня ЦК КП(б) ЛіБ В. С. Міцкявічус-Капсукас у гэты час адсутнічаў, а пытанне чакала тэрміновага вырашэння, В. Г. Кнорын звярнуўся з пісьмом да яго, паведамляючы аб складанасцях, якія ўзнікалі пры абмеркаванні зямельнай праблемы. «У працэсе абмеркавання знаходзіцца пытанне аб зямлі,— пісаў В. Г. Кнорын,— па якому ёсць тры думкі — Цыхоўскага і Далецкага і кампраміснае — Ангарэціса. Учора было пашыранае пасяджэнне, але рэзалюцыі не выпрацавалі. Пытанне можна будзе распрацаваць толькі праз тыдзень. З выпадку існуючага рознагалосся неабходна Ваша прысутнасць... Мы лічым, што ў сувязі з гэтай работай неабходна Вам быць тут і настойваем на Вашым неадкладным прыездзе, бо без Вас вырашыць пытанне, напрыклад, аб зямлі, няёмка і не след» [8].

В. Г. Кнорын пільна сачыў за разгортваннем падзей на франтах. У пачатку ліпеня Чырвоная Армія вызваліла Мазыр і Калінкавічы. Ён заклікаў сялян, чырвонаармейцаў зрабіць усё магчымае, каб вырашчаны ўраджай трапіў у савецкія засекі, а не ў рукі ворагаў. У той жа час патрабаваў ад рэўкомаў больш умелага кіраўніцтва, змагацца з абывацельшчынай, кар'ерызмам, асабістымі непаразуменнямі. «З гэткім багажом,— пісаў В. Г. Кнорын,— мы не можам рухацца наперад, з такім багажом цяжка выканаць тыя вялікія задачы, якія дадзены савецкім органам... Няхай нашы рэўкомы сур'ёзна паглядзяць вакол, няхай лепш усвядомяць свае задачы, няхай падцягнуцца па-вайсковаму і падцягнуць іншых» [9].

Ён заклікаў усіх супрацоўнікаў адкінуць чамаданныя настроі, узмацніць сваю работу, не шкадуючы сіл, рабіць усё для перамогі. «Няхай кожны беларускі работнік, вялікі і малы, запамятае, што права на першачарговае накіраванне на адпаведную працу ў Беларусі атрымаюць тыя, хто штодзённа, да самазабыцця працаваў на даручаным яму ўчастку і практычна даказаў сваю адданасць справе партыі і рэвалюцыі» [10].

11 ліпеня 1920 г. Мінскі губрэўком у саставе А. Р. Чарвякова, В. Г. Кнорына і І. А. Адамовіча разам з наступаючымі часцямі Чырвонай Арміі прыбыў у Мінск і ў першым сваім загадзе аб'явіў аб пераходзе да яго ўсёй грамадзянскай і ваеннай улады ў губерні [11].

У дзень вызвалення Мінска выйшла газета «Звезда». В. Г. Кнорын на яе старонках звяртаўся да рабочых і сялян Беларусі, што неабходна зрабіць так, каб Беларусь была прыкладам для мяжуючых з ёю краін Захаду, да якіх праз яе пракладваецца шлях да сацыялістычнай рэвалюцыі.

Выбраны намеснікам старшыні Мінскага губернскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта В. Г. Кнорын прымаў меры па ахове правапарадку ў горадзе і губерні, ажыўленню гандлю і аднаўленню работы ўцалелых прадпрыемстваў. Працоўны дзень яго цалкам прысвячаўся справам: выступаў перад рабочымі горада, выязджаў у паветы, гутарыў з сялянамі, фарміраваў кадры для партыйных і савецкіх устаноў, наладжваў дапамогу Чырвонай Арміі, ствараў нанава разбітыя белапольскімі захопнікамі партыйныя арганізацыі. Было працягнута вылучэнне партыйна-арганізацыйных троек для вызваляемых тэрыторый. Так былі вылучаны тройкі для Мазырскага, Слуцкага, Пружанскага, Брэсцкага, Кобрынскага, Пінскага і іншых паветаў.

У разрабленых паветах насельніцтва адчувала вялікія цяжкасці з

---

[7] ПАІГП пры ЦК КПБ, ф. 4, воп. 1, с. 39, л. 7.
[8] ПАІГП пры ЦК КП Літвы, ф. 77, воп. 3, с. 2. л. 15—16.
[9] Кнорин В. Нужно улучшить работу // Звезда. 1920. 3 ліп.
[10] ЦПАІМЛ пры ЦК КПСС, ф. 71, воп. 15, с. 59, л. 104.
[11] Петриков П. Т. Ревкомы Белоруссии. Минск, 1975. С. 69.



Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы